Грамадска-палітычная газета для жыхароў Бялыніцкага, Круглянскага і Шклоўскага раёнаў

# Рэгіён

**Студзень 2010 г.**

# НА ШТО ІДУЦЬ ГРОШЫ З БЮДЖЭТУ? (ЗВАРОТ ДА ДЭПУТАТАЎ ПП НС РБ)

9 снежня 2009 года дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь ухвалілі ў першым чытанні праект бюджэту краіны на 2010 год. Адным лёгкім націскам кнопкі "народныя абраннікі " вырашылі лёс фінансавых сродкаў, напрацаваных беларускім народам за цэлы год. А ці задумаліся яны, як жа расходуюцца народныя грошы?

Прапаную Вам, шаноўныя чытачы, разгледзець працэс марнавання бюджэтных сродкаў на прыкладзе выканання Дзяржаўнай праграмы "Чыстая вада ".

10 лістапада 2009 года на паседжанні Прэзідыума Саўміна, які праходзіў пад старшынствам прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Уладзімір Белахвостаў запатрабаваў выдзялення на фінансаванне праграмы "Чыстая вада" у 2011-2015 г. сродкаў у памеры каля 2,0 трлн. беларускіх рублёў.

"Калі папярэдняя праграма на 2006-2010 гады ставіла задачу забяспечыць чыстай вадой усе гарады, райцэнтры, пасёлкі гарадскога тыпу, то ў перспектыве праблема чыстай вады павінна вырашацца і ва ўсіх населеных пунктах Беларусі"- адзначыў міністр.

Зададзімся пытаннем, а што ж уяўляе сабой папярэдняя праграма?

Згодна пастановы Савета



*Рыгор Кастусёў*

Міністраў Рэспублікі Беларусь № 720 ад 07 чэрвеня 2006 года была зацверджана цэлая **Праграма развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь на 2006-2010 гады**, якая шчыльна ўвязана з **Дзяржаўнай праграмай па водазабяспячэнню і водаадвядзенню "Чыстая вада" на 2006-2010 гады**.

Рэалізацыя мерапрыемстваў указаннай Праграмы павінна спрыяць далейшаму развіццю сістэм пітнога водазабяспячэння і водаадвядзення, павышэнню якасці падаваемай спажыўцам пітной вады і ачысткі адвадзімых сцёкавых вод і г.д.

У мэтах развіцця сельскіх тэрыторый, матывацыі пражывання ў сельскай мясцовасці, Праграмай прадугледжваецца

*(Заканч. на ст. 2)*

# Бюджэт Круглянскага раёна на 2010 год паменшаны

На нядаўна прайшоўшай сесіі Круглянскага раённага Савета дэпутатаў зацверджаны бюджэт раёна на 2010 год.

Даходы па праекту бюджэту раёна прагназуюцца ў памеры 31.5 млр. рублёў і памяншаюцца ў параўнанні з выкананнем 2009 года на 1,8 млр. рублёў (94,6 %). Уласныя даходы Круглянскага раёна прагназуюцца з ростам – 116,8 %, бязвыплатныя паступленні (датацыя) з абласнога бюджэту – 18,3 млрд. рублёў альбо 83,4 працэнта ад чаканага паступлення ў 2009 годзе (48,1 % у агульных даходах бюджэту).

Разліковыя паказчыкі на 2010 год па расходах у Круглянскім раёне вызначаны ў агульнай суме 28,2 млн. рублёў альбо 78,5 працэнта к выкананню 2009 года.

Як бачна з прыведзеных вышэй лічбаў, бюджэт Круглянскага раёна па расходнай частцы вельмі значна ўрэзаны, уведзены цвёрдыя бюджэтныя абмежаванні на выкананне важных сацыяльных праграм.

*(Заканч. на ст. 3)*



*Круглянскі раён*

# НА ШТО ІДУЦЬ ГРОШЫ З БЮДЖЭТУ? (ЗВАРОТ ДА ДЭПУТАТАЎ ПП НС РБ)

(Заканч. Пач. на ст. 1)



забяспячэнне сельскага насельніцтва пітной вадой, адпавядаючай па якасці санітарна – гігіенічным патрабаванням. Для чаго запланавана да канца 2010 года пабудаваць, аднавіць, рэканструіраваць больш за 2,1 тыс. артэзіанскіх свідравін і 2,0 тыс. кіламетраў водаправодных сетак, наладзіць працу перасоўных хларатарных установк для дэзінфекцыі сельскіх вадаправодаў і шахтных калодзежаў.

Фінансавае забяспячэнне мерапрыемстваў па выкананню Праграмы "Чыстая вада" на 2006-2010 гады складае ў агульнай колькасці 625,8 млрд.рублёў, у т.л. за кошт сродкаў мясцовых бюджэтаў – 197,3 млрд., рэспубліканскага бюджэту – 407,5 млрд.

Да заканчэння тэрміну выканання Праграмы засталося крыху больш аднаго года. Як адзначыў у сваёй справаздачы У.Белахвостаў, у цэлым праграма "Чыстая вада" выконваецца паспяхова... Гэта значыць, з яго слоў: па-першае - своечасова ўзводзяцца запланаваныя аб'екты і паляпшаецца якасць пітной вады, па другое – своечасова асвойваюцца запланаваныя фінансавыя рэсурсы... І тут, калі ў другое можна паверыць, што бюджэтныя сродкі расходуюцца своечасова, то рэальны стан рэчаў па забяспячэнню насельніцтва краіны якаснай пітной вадой (пра паляпшэнне сісітэм водаадвядзення нават пакуль няма і гаворкі), асабліва ў сельскай мясцовасці, цалкам адвяргае першае.

За апошнія некалькі гадоў амаль ва ўсіх рэгіёнах краіны сітуацыя з якасцю вады, падаваемай па сістэмах водазабяспячэння, рэзка пагоршылась. Асаблівую трывогу вызывае стан вадаправодаў у сельскай мясцовасці, дзе нярэдка ўсялякія разумныя падыходы па іх эксплуатацыі проста адсутнічаюць. Якасць жа вады ў вясковых шахтных калодзежах, якімі карыстаюцца шматлікія сяльчане ды і гараджане ў часы летніх адпачынкаў, нярэдка вызывае жах. У такой вадзе можна знайсці шматлікія элементы табліцы Мендзялеева, і ў першую чаргу састаўляючыя ўгнаенняў, выкарыстоўваемых у сельскай гаспадарцы.

Нават старшыня Камітэту дзяржаўнага кантролю Зянон Ломаць, у сваім выступе на паседжанні прэзідыума адзначыў факты пагаршэння якасці пітной вады ў некаторых рэгіёнах краіны.

Па многіх аб'ектах, уключаных у Праграму, аб'ём выканання складае за год да плануемага завяршэнне меней 50%.

У 2008 годзе Сусветным банкам па пагадненню з Урадам Беларусі было выдзелена 60 млн. долараў ЗША. Выдзеленыя Сусветным банкам фінансавыя сродкі планавалась выкарыстаць для будаўніцтва 9-ці ачышчальных збудаванняў на працягу 2008-2010 гадоў. Але на 1 лістапада 2009 года з дадзенай сумы выкарыстаны сродкі ў памеры ўсяго толькі 420 млн. беларускіх рублёў, што адпавядае крыху больш $150 тыс.

Як паказваюць прыведзеныя вышэй лічбы і факты, выкананне Праграмы "Чыстая вада" зрываецца, а разам з ёй не выконваецца і Праграма развіцця жыллёва-камунальнай гаспадаркі. І гэта не могуць не разумець удзельнікі пасяджэння Прэзідыуму Савета Міністраў.

Але ж узнікае пытанне, куды падзелісь народныя грошы?

Хацелась бы задаць падобнае пытанне і "народным абраннікам", г.зн. дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь.

*Намеснік старшыні Партыі БНФ Рыгор Кастусёў.*

## Праваленая бальшыня прагнозных паказьнікаў за 2009 год

Па выніках 2009 году ня выканана бальшыня прагнозных паказьнікаў сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця Беларусі, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.

Аб'ём валавага ўнутранага прадукту склаў 100,2% да 2008 году. Плянам прадугледжваўся прырост на 10-12%. Для параўнаньня: у 2008 годзе прырост беларускага ВУП склаў 10,2%. Тэмпы росту эканомікі скараціліся за год у 51 раз.

Аб'ём прамысловай вытворчасьці ў 2009 годзе скараціўся на 2,8% (прагназаваўся рост на 10-12%). У 2008 годзе быў рост на 11,5%.

Аб'ём інвэстыцыяў у асноўны капітал павялічыўся на 8,6% (прагноз 23-25%, у 2008 годзе — 23,5%). Скараціліся на 4,9% перавозкі грузаў. На 2,5% менш за плян уведзена жытла. Колькасьць беспрацоўных павялічылася за год на 8,1% і склала на 1 студзеня 2010 году 40,3 тысячы (у 2008-м скарацілася на 15,4%).

*Радыё Свабода*

# Бюджэт Круглянскага раёна на 2010 год паменшаны

*(Заканч. Пач. на ст. 1)*

Вялікае пытанне, ці будзе выкананы і гэты, значна ўрэзаны, бюджэт на 2010 год. У мінулым 2009 годзе, у сувязі з невыкананнем даходаў агульнарэспубліканскага бюджэту, Круглянскаму раёну была зменшана датацыя на 7,2 млр. рублёў. Гэта прывяло да таго, што шэраг прадугледжаных расходаў было недафінансавана і адпаведна да рэзкага росту крэдыторскай запазычаннасці бюджэтных арганізацый Круглянскага раёна за выкананныя работы, аказаныя паслугі і атрыманыя таварнаматэрыяльныя каштоўнасці на суму каля двух мільярдаў рублёў.

Уласныя даходы Круглянскага раёна ў 2009 годзе склалі 11,2 млр. рублёў, раён выжывае толькі за кошт датацый з абласнога і рэспубліканскага бюджэту.

Нягледзечы на гэта, сярэдняя заработная плата ў Круглянскім раёне за 11 месяцаў 2009 года склала 879,9 тыс. рублёў пры тэмпе росту к 2008 году 121,7 %. Па памеры сярэдняга заробку раён займае першае месца сярод сельскіх раёнаў Магілёўскай вобласці, у працоўнікоў іншых раёнаў нашага рэгіёна – Шклоўскага і Бялыніцкага – сярэдняя заработная плата значна ніжэй.

*Іван Барысаў*




# РАЙ ПО-АЛЕКСАНДРИЙСКИ



*Деревня Александрия Шкловского района*

Деревня Александрия Шкловского района знаменита тем, что здесь родился первый президент Беларуси Александр Лукашенко. В последнее время на эту землю словно пролился золотой дождь. Александрия перестала быть деревней в советском понимании этого слова. Буквально на днях здесь введен в эксплуатацию шикарный детский сад. Но это вовсе не одинокая новостройка. Не так давно построена гостиница, намного лучшая, чем в районном центре. Действует современный спортивно-оздоровительный комплекс. Все строятся и строятся новые жилые дома. Это перемены, происходящие в центре ОАО «Александрийское», а на территории хозяйства, вобравшего в себя треть сельхозугодий района, выстроены пять молочно-товарных комплексов, свиноводческий комплекс с убойным цехом. Сдано в эксплуатацию грандиозное по размерам и оснащенности фруктохранилище...

В чем же причины гигантских преобразований? В таких случаях обычно говорят, все поменялось с приходом нового руководителя, мол, появился деятельный специалист, сам проявил инициативу, потребовал от подчиненных, — и завертелась карусель...

Но в данном случае это клише не срабатывает. Руководитель ОАО «Александрийское» появился здесь два года назад, а бурное развитие на родине Лукашенко началось давно. И дело-то в том, что здесь – родные места главы государства. Власть решила построить здесь своеобразный рай.

Указом президента пять лет назад за Нацбанком были закреплены 12 ОАО, среди них и «Александрийское». Можно допустить, что для главного банкира страны Петра Прокоповича это нововведение стало радостью, он-то по сути своей, по специальности, по роду занятий не финансист, а сельский строитель, и на банкира стал учиться, попав в кресло председателя Нацбанка.

Мне удалось попутешествовать по хозяйству, посмотреть на объекты. Внутрь попасть невозможно: и потому что строгий ветеринарный контроль, и чужакам здесь не очень привечают. Попасть на прием к руководителю ОАО «Александрийское» Виктору Дюрдю, увы, не удалось.

*(Продолж.. на ст. 4)*

# РАЙ ПО-АЛЕКСАНДРИЙСКИ

*(Продолж. Нач. на ст. 3)*

Секретарь приемной, молодая красивая женщина, объяснила, что ее босс с представителями негосударственной прессы не общается. И вообще прессу не очень жалует, потому что можно невольно выдать нежелательные сведения. Попытки узнать у специалистов что-либо о стоимости объектов провалились. Один специалист шепотом сказал, от Прокоповича поступила команда: «Не болтать!» Информация о стоимости объектов – предмет особой тайны.

Поговорив с доярками одного из молочно-товарных комплексов, узнал, что зарплата в осенне-зимнее время не превышает 600 тысяч рублей в месяц, летом, в период большого молока она возрастает тысяч до 800. Золотой дождь в карманы работников, как видно, не льется.

Но условиями работы довольны, потому что ничего лучшего в округе нет.

Поток желающих устроиться в ОАО «Александрийское» не ослабевает, правда, и отток почти такой же. Новичку сначала выделяют место в общежитии, чтобы присмотреться к нему, нет ли вредных привычек, как он будет относиться к работе. Если не приглянется, то пожелают катиться колбаской. Дома выделяют лишь тем, кто уже прошел через испытание общежитием.

Дисциплина в хозяйстве не идеальная. Рассказывают, что новый директор Виктор Дюрдь был шокирован, когда понял, что механизаторы позволяют себе, как говорится, закинуть за воротник перед тем, как покинуть мехдвор. Попробовал воспитывать, так словесно, а они слушают в пол-уха. А после воспитательной беседы вновь стали куражиться, декать, лучших механизаторов в округе не найти, подоспеет жатва, — и директору надо будет к ним на поклон идти.

Дюрдь оказался более твердым мужиком, чем подумали механизаторы. За пьянку стал безжалостно увольнять и ни к одному из нарушителей не пошел с поклоном перед жатвой. Обошлось!

Но ему в отличие от своих коллег не приходится ходить с поклоном в поисках копейки, пробивать в высоких инстанциях какие-либо решения. При наличии такого влиятельного патрона, как Петр Прокопович, многие проблемы решаются без существенных усилий.

Представьте себе, что в ОАО еще только заложен сад (около 200 гектаров), еще только собран пробный небольшой урожай, около 400 тонн, а рядом с садом уже выстроено фруктохранилище. В нем свободно разместятся около 6 тысяч тонн плодов, а пока в нем — пустота. Огромные средства не дают, потому что просто не могут давать отдачи. Кому бы еще такое было позволено?!

Выходит, что у Нацбанка есть деньги, которыми он способен манипулировать по собственному усмотрению, возможно, только по воле председателя Нацбанка. Это закрытая часть экономики, и поскольку деньги вливаются в ОАО, то нельзя исключить, что то или иное хозяйство будет развиваться с учетом чьих-то личных интересов.

В Шкловском районе возникли серьезные проблемы с продажей молока. Деревня его производит, но терпит при этом убытки. Преградой на пути к прибыли стала твердая установка сдавать молоко только на местный завод. Объединение «Бабушкина крынка» диктует цены, исходя из собственных корпоративных соображений, зачастую произвольно определяя качество молока. По свидетельствам специалистов управления сельского хозяйства район теряет миллионы рублей. Но продавать продукт в Россию, например, не может. Запрещено! Запрещено всем, и только лишь ОАО «Александрийское» может, как похвастались доярки одного из комплексов, отправлять свое молоко аж в Псковскую область.

В райцентре появилось одно проблемное предприятие. Его специализация – комбикорма для коров, свиней, кур. Еще недавно оно процветало, но в один миг стало хиреть. В чем же причина? Появился мощный конкурент. В ОАО «Александрийское». Там выстроен современный завод по самой современной технологии. Один из экспертов в этой области считает, что это правильный путь. Производить комбикорма непосредственно в хозяйствах выгоднее. Другое дело, что надо было учесть интересы предприятия, которое существует многие годы, и не бросать коллектив на произвол судьбы.

Один из водителей ОАО «Александрийское» похвастался, что хозяйство закупает только импортные машины. Не так давно, например, прибыли два грузовика немецкой фирмы «Манн». Они будут обслуживать комбикормовое предприятие. Продукция МАЗа проигнорирована, хотя по установленным правилам разрешение даже на незначительные закупки за рубежом надо получать в министерстве. Но строгие правила пишутся исключительно для простых смертных.

Таким же образом подходят

*(Оконч. на ст. 5)*

# РАЙ ПО-АЛЕКСАНДРИЙСКИ

*(Оконч. Нач. на ст. 3-4)*

в ОАО «Александрийское» и при закупках кормоуборочной техники. Предпочтение отдается машинам западноевропейских фирм.

— А чем вам не нравятся гомельские комбайны? – спрашиваю у механизатора Виктора.

— Мы бы с ними кукурузу убирали до коляд! – ответил он.

В Александрии создается оазис производственного благополучия. Производство молока модернизировано. При свиноводческом комплексе построен убойный цех, пока он отправляет в торговлю полуфабрикаты, но в ближайшем будущем появится и собственный мясокомбинат. Техника – только лучших марок.

Правда, отношение к людям, к зарплате такое же, как и везде в нашей стране: платить минимум, а требовать по-полному. Александрийский рай – не достижение, а, скорее, гримаса экономики.

*Василий КОЧЕВОЙ, «Рабочая солидарность»*

# Сярэдні заробак знізіўся на 13 тысяч рублёў

Сярэдні налічаны заробак у Беларусі ў лістападзе знізіўся ў параўнанні з кастрычнікам больш чым на 13 тысяч рублёў, інфармуе «Наша ніва».

Нацыянальны статыстычны камітэт паведамляе, што налічаны сярэдні заробак работнікаў па краіне ў лістападзе склаў 1 млн 12 тыс. 903 рублі (у кастрычніку — 1 млн 26 тыс. 187 рублёў), рабочых і служачых — 1 млн 31 тыс. 281 рубель (у кастрычніку — 1 млн 42 тыс. 692 рублі).

# “Ня дай Бог, хто памрэ — ня вывезеш”




Ад наступстваў моцных завеяў у Беларусі найбольш церпяць насельнікі аддаленых вёсак. У кожным рэгіёне дзесяткі, а то і сотні невялікіх паселішчаў застаюцца ў змушанай ізаляцыі. Сюды не даяжджаюць рэйсавыя аўтобусы, аўталаўкі, пошта і «хуткая дапамога». Часта не ўпраўляюцца аднаўляць электрычнасьць тэхнічныя службы.

У гэтым людзі вінавацяць ня толькі надвор’е, але і мясцовую ўладу. Меркаваньні жыхароў занесеных сьнегам вёсачак запісалі днямі рэгіянальныя карэспандэнты «Свабоды».

На Магілёўшчыне сьнегаўборачная тэхніка працуе галоўным чынам на цэнтральных дарожных магістралях. Да вёсак у глыбінцы яна не даходзіць.

За два дзясяткі кілямэтраў ад райцэнтру Бялынічы знаходзіцца вёска Сямікаўка. Тут жыве васямнаццаць чалавек — усе пэнсіянэры. Амаль тыдзень яны ў сьнежным палоне:

«Ніхто ня чысьціў і ня чысьце. Пэнсіянэры бяруць палкі й з палкамі плывуць. Вось калі чалавек, ня дай Бог, памрэ, я ня ведаю, як яго зь вёскі вывезьці. Адно шчасьце, што тэлефон ёсьць. Каму мы патрэбныя? Мы патрэбныя былі, калі працавалі», — наракае жыхарка Сямікаўкі.

Жыхары завеянай вёскі штомесяц плацяць дзяржаве па дзьве тысячы рублёў за вываз сьмецьця. Грошы гэтыя невялікія, кажуць вяскоўцы, аднак і сьмецьце не вывозіцца:

«Колькі разоў зьвярталіся, тэлефанавалі, што ў нас сьмецьця няма. На гэта нуль увагі. Дык няхай бы яны за гэтыя грошы, што бяруць за сьмецьце, пачысьцілі нам дарогу».

У саўгасе «Падзевічы», на тэрыторыі якога знаходзіцца Сямікаўка, заявілі, што дарогу да вёскі абавязана чысьціць дарожная ўправа № 170:

«Учора цэлы дзень мяла завея, таму гэтая вёска фактычна не расчысьцілася. Сёньня тэхніка ўся працуе. У нас, на тэрыторыі гаспадаркі, 28 населеных пунктаў. Гэтая вёска знаходзіцца крыху ўбаку, аднак сёньня вёску расчысьцяць», — паведаміў прадстаўнік адміністрацыі саўгасу.

*Радыё Свабода*

# ПРАВИТЕЛЬСТВО НЕ ЖЕЛАЕТ ПРИЗНАВАТЬ СВОИХ ОШИБОК

**В сентябре – октябре 2009 года в Могилевской области было собрано более трех тысяч подписей избирателей под заявлением к депутатам ППНС РБ с предложением обратиться к Премьер-министру страны по вопросу полного возврата отмененных в 2008 году льгот на медицинское обслуживание для всех категорий граждан (пенсионеров, детей, инвалидов) и принятия соответствующего нормативного акта.**

Инициаторами данной кампании выступили оргкомитет по созданию Могилевской областной общественной организации «Комитет гражданского контроля» и Координационный Совет Могилевской областной коалиции демократических сил.

Такая инициатива возникла не случайно, перед началом сбора подписей путем анкетного опроса был проведен мониторинг местных проблем в шести регионах области. Большинство опрошенных отметило неудовлетворительное качество здравоохранения и высказалось за возвращение льгот на медицинское обслуживание.

Сбор подписей был организован по 9-ти избирательным округам Могилевской области, по каждому избирательному округу было собрано более трехсот подписей избирателей.

29 октября, по этой проблеме в Могилеве был организован круглый стол с участием представителей общественности и принято обращение, которое вместе с заявлениями с подписями избирателей были отправлены в адрес 9-ти депутатов ППНС РБ от Могилевской области, избранных по этим округам.

Через месяц три из девяти депутатов дали ответ о том, что полученные заявления с подписями избирателей они направили «... для рассмотрения и принятия мер Главе Правительства Республики Беларусь Сидорскому С.С.». А в конце декабря пришел ответ из Министерства труда и социальной защиты, на 5-ти страницах.

Ознакомившись с ответом правительства и изучив другие материалы по данной проблеме становиться совершенно очевидным, что позиция правительства кардинально расходится с реальной потребностью большого количества людей нуждающихся в бесплатных медицинских услугах.

***Информация для справки:***

**На учете в органах по труду, занятости и социальной защите состоит более 506,3 тысяч инвалидов, иными словами, практически каждый двадцатый гражданин нашей страны.**

**По состоянию на 1.11.2009г. средние размеры пенсий составляют: трудовых по инвалидности – 392,7 тыс. руб.; социальных для инвалидов с детства – 188,6 тыс. руб., инвалидов вследствие общего заболевания – 160,3 тыс. руб., детей-инвалидов – 197тыс. руб.**

**274 тыс. человек - детей в возрасте до 3 лет.**

**Пособие по уходу за ребенком в возрасте до 3 лет назначается в размере 80 процентов наибольшей величины бюджета прожиточного минимума. Что в денежном выражении составляет 200 тыс. рублей.**

**4,6 тыс. граждан - заболевших и перенесших лучевую болезнь.**

**66 тыс. человек - ликвидаторов аварии на ЧАЭС 1986-1987 годов.**

**около 1 млн. 322 тыс. человек – гражданах проживающих на территории радиоактивного загрязнения.**

**почти 2 млн. человек - особая категория льготников - ветераны труда. Она самая многочисленная.**

**23,6 тыс. ветеранов боевых действий на территории других государств.**

**Несмотря на отмену большого количества льгот, государство израсходовало на них около 500 млрд. рублей.**

**Сэкономленные от отмены льгот средства составляют примерно 240 млрд. рублей.**

Как видим, вся экономия составила менее одной трети от расходуемых бюджетных средств и это с учетом того, что до отмены льгот было 50 категорий льготников и около 100 видов социальных льгот.

Что же собой представляет нововведенная государственная социальная помощь (ГАСП)?

Действительно все выше перечисленные категории граждан имеют право на получение данной помощи, ноесть много

*(Оконч. на ст.7)*

# ПРАВИТЕЛЬСТВО НЕ ЖЕЛАЕТ ПРИЗНАВАТЬ СВОИХ ОШИБОК

*(Оконч. Нач на ст.6)*



НО...

***Первое:*** - получить данную помощь не может инвалид, пенсия которого составляет более 250 тыс. рублей.

***Второе:*** - инвалид с более низкой пенсией, совокупный доход семьи которого на одного члена семьи, больше 250 тыс. рублей в месяц так же этой помощи не получит.

***Третье:*** - размер пособия составляет разницу от полученной пенсии - до 250 тыс. рублей.

***Четвертое:*** - получить такое пособие можно только один раз в три месяца. Но не более двух раз в год.

***Пятое:*** - что бы получить так называемый ГАСП, необходимо собрать два раза в год кучу справок всем членам семьи.

**Такая же ситуация и с получением социальной помощи по уходу за ребенком в возрасте до 3-х лет.**

К примеру, получая минимальную пенсию по инвалидности в размере 160 тыс. рублей в месяц, за год можно получить не более 180 тыс. рублей государственной социальной помощи. При этом не важно, сколько реально в месяц потребуется человеку средств на приобретение лекарств.

То, что на так называемый ГАПС израсходовано 500 миллиардов рублей совсем не значит, что эти деньги дошли до нуждающихся, значительная их часть пошла на создание и содержание различного рода «Центров социальной помощи» и т.п., а так же на зарплату обслуживающего их персонала. Создается только видимость заботы о человеке, реальной же помощи практически нет.

Итог не утешителен, на сегодняшний день в Республике Беларусь 4 мил. 196.2 тыс. человек, в различной степени нуждающихся в постоянной медицинской помощи. Практически это почти половина населения страны.

**Цена вопроса 60 -70 миллионов у.е. в год.** Правительство должно признать, что допустило грубейшую ошибку при решении этой проблемы и немедленно её исправить. Слишком дорогой ценой приходиться платить за неё Беларускому Народу – собственным здоровьем.

*Информационно-правовой центр*

## Убийство в Шкловском районе

В ходе проведения оперативно-розыскных мероприятий установлено, что житель деревни Августово Шкловского района (1971 г.р.), ранее судимый за незаконные действия в отношении огнестрельного оружия, в 2004 году, в своем доме, в ссоре, после совместного распития спиртных напитков, избил уроженца Шкловского района (1975 г.р.), без определенного места жительства и рода занятий, который умер. После этого, с целью сокрытия преступления, односельчанин (1970 г.р.) по указанию преступника тело вывез в лесной массив вблизи деревни и закопал. Останки обнаружены. Подозреваемый в убийстве задержан.

# В Круглянском районе на охоте застрелили офицера МВД



Прокуратура Круглянского района (Могилевская область) расследует дело по ч. 1 ст. 144 Уголовного кодекса (причинение смерти по неосторожности) в отношении 26-летнего рабочего одного из местных предприятий.

**Как рассказал *БелаПАН* прокурор района Геннадий Ярмак, 12 декабря на охоте вблизи деревни Липск выстрелом из охотничьего ружья был смертельно ранен 28-летний офицер внутренних войск МВД. Спасти его врачам не удалось.**

**Офицер и его знакомый земляк встретились на охоте. Занимались ею по отдельности. Заместитель командира роты в/ч 5523 внутренних войск МВД, дислоцирующейся в Могилеве, находился вне службы. Оружие у обоих было зарегистрировано. В части исполнения правил охоты у правоохранительных органов к ее участникам претензий нет, сказал Геннадий Ярмак.**

**Случайный выстрел в сторону офицера внутренних войск в результате неосторожного обращения с оружием был произведен примерно в 11 часов. По словам прокурора района, проверяется версия о нарушении правил безопасности на охоте.**

*Усяго патроху*

# Памылка ў газеце «Наша Талачыншчына» прывяла да смерці маці траіх дзяцей-інвалідаў




У вёсцы Звенячы ад разрыву аорты памерла 40-гадовая жанчына, хаця раней дактары ў яе хваробы сэрца не выяўлялі. Прычынай, што сэрца не вытрымала стала публікацыя ў раённай газеце, дзе жанчыну назвалі алкагалічкай. Газета публікавала справаздачу пра рэйд інспекцыі па справах непаўнагадовых.

Насамрэч, жанчына алкаголь не ўжывала, але інспекцыя ў яе дом заходзіла, бо тая выхоўвае траіх дзяцей-інвалідаў, а жывуць не багата. Сама яна працавала ў СПК «Звенячы», а муж на чыгунцы. Зразумела, што эканамічны стан сям'і не назавеш самым лепшым.

Не зважаючы на трагедыю газета не прызнае памылку ў артыкуле і не збіраецца пісаць абвяржэнне. Вінаватымі рэдактар называе інспекцыю, маўляў, тыя далі неправільныя звесткі. Інспекцыя свайго слова яшчэ не сказала, але ж, напэўна, таксама віны сваёй не прызнае. А дзеці – інваліды засталіся без маці.

*orsha.belarda.org*

# У Магілёве застрэліўся міліцыянэр

Прапаршчыка Ленінскага райаддзелу Магілёўскага дэпартамэнту аховы МУС знайшлі мёртвым у ягонай уласнай кватэры 8 студзеня.

Супрацоўнік міліцыі стрэліў сабе ў грудзі з паляўнічай стрэльбы ІЖ-27. Зараз пракуратура праводзіць праверку. Паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай суіцыду сталі асабістыя матывы, паведамляе БелаПАН.

Гэта першае самагубства супрацоўніка міліцыі ў 2010 годзе. Паводле дадзеных МУС, у 2009 годзе суіцыд учынілі 14 супрацоўнікаў міліцыі.

*Радыё Свабода*

## ДАІ інфармуе

За мінулы 2009 год на тэрыторыі Шклоўскага раёна зарэгістравана 28 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 7 чалавек загінула і 29 атрымалі раненні рознай ступені цяжкасці, 4 ДТЗ адбылося па віне нецвярозых кіроўцаў.

# Против смертной казни

Ошибки правоохранительных органов, конечно же, дело плохое. Но еще страшнее то, что в белорусском государстве преступников часто не ищут, а назначают. И с помощью разного рода пыток выбивают признание, включая так называемую явку с повинной.

Один пример. В 2005 году в деревне Большая Мощаница Белыничского района Могилевской области убили семью из шести человек.

Отечественные «пинкертоны» схватили четырех парней, которые первыми подвернулись под руку и выбили из них признательные показания.

При этом даже не обратили внимания на явную нестыковку: следователи утверждали, что обвиняемые убивали ножом и топором, а на трупах не было ни одной раны от этих предметов? Тем не менее, прокуратура настаивала на смертном приговоре.

Могилевский областной суд невиновных оправдал. Но то — редчайшее явление правоохранительной системы Беларуси. Обычно суды выносят исключительно обвинительные приговоры.

Достаточно вспомнить казненного по «витебскому делу» вместо маньяка Михасевича ни в чем не повинного Тереню...

В настоящее время в Беларуси проходит кампания «Правозащитники против смертной казни». Кампания стартовала 26 января 2009 года. В акции принимают участие представители правозащитного сообщества из белорусского Хельсинкского комитета, правозащитного центра «Весна», гражданской кампании «Наш Дом» и других.



Акция намеревается продолжать, пока правящая в Беларуси власть не введет мораторий на применение смертной казни.

*"Наш дом"*

Рэгіён

Грамадска-палітычная газета.
Выдаецца на беларускай і рускай мовах,
распаўсюджваецца бясплатна

Надрукавана на ўласным абсталяванні па адрасе: Бялыніцкі р-н, в. В. Машчаніца. тэл. 37-110. Наклад 299 асобнікаў. Выдавец Вырвіч Б. І. Падпісана ў друк 14.01.2010 г. у 14.00